# Чытайце бюлетэнь «НОВЫЯ КНІГІ»

Адметнай рысай нашага часу з'яўляецца цікавасць да роднай гісторыі, культуры, мовы. Але наўрад ці хто-небудзь мае магчымасць праглядаць усю друкаваную прадукцыю, каб знайсці патрэбную інфармацыю. Дапамагчы ж у гэтым могуць бібліяграфічныя дапаможнікі, у прыватнасці штомесячны бюлетэнь «Новыя кнігі БССР», які выдае Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна. Многія, магчыма, не ведаюць пра існаванне такога выдання. А яму ж летась споўнілася 30 гадоў. Напэўна, гэтае няведанне можна растлумачыць тым, што бюлетэнь адрасаваны ў першую чаргу бібліятэчным работнікам. Менавіта яны павінны знаёміць чытачоў з бібліяграфічнымі дапаможнікамі. Але ў грамадстве склаліся недаравальна абыякавыя адносіны да бібліяграфіі, да руплівай працы бібліёграфа.

Што ж прапануюць «Новыя кнігі БССР» сёння? Пачынаецца выданне раздзелам «Навінкі беларускага друку». Ён інфармуе аб новых кнігах, у тым ліку і кааператыўных выдавецтваў, і найбольш значных, цікавых артыкулах з папулярных рэспубліканскіх газет і часопісаў. Тым, каго цікавіць гісторыя рэспублікі, яе надзённыя праблемы, карысна будзе сачыць за літаратурай, што падаецца ў раздзеле «Пра Беларусь і беларусаў».

Наступны раздзел — «Папулярна аб усім» — прапануе літаратуру па ўсіх галінах ведаў, пра тое, што адбывалася і адбываецца ў свеце.

У трэці раздзел «Мастацкая літаратура» ўключаны звесткі пра творы як асобна выдадзеныя, так і надрукаваныя ў беларускіх часопісах. Асаблівая ўвага ўдзяляецца тым аўтарам, якія былі незаслужана забыты, рэпрэсіраваны і раней публікаваліся вельмі мала ці не публікаваліся наогул. Раздзел «Кнігі — дзецям» прадстаўляе юным чытачам новыя выданні навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры, казкі. Спецыялісты розных прафесій атрымаюць інфармацыю аб новых кнігах у раздзеле «У дапамогу прафесійнаму чытанню».

Выбраць лепшыя кнігі па той ці іншай галіне ведаў, пазнаёміцца з ацэнкай крытыкаў новай літаратуры дапаможа наступная частка бюлетэня «У полі зроку рэцэнзента».

Цікавымі для многіх чытачоў, на нашу думку, будуць і бібліяграфічныя матэрыялы да беларускага календара, якія штомесяц змяшчаюцца пад загалоўкам «Памятныя даты».

У адным з апошніх нумароў бюлетэня штогод змяшчаецца спіс памятных дат беларускага календара на наступны год.

Бюлетэнь павінен быць у любой масавай бібліятэцы. А найбольш зацікаўленыя могуць на яго падпісацца. Індэкс выдання 74972. Кошт гадавой падпіскі — 5 р. 40 к.

**І. НАРЧУК,**
**загадчык сектара навукова-бібліяграфічнага аддзела Дзяржбібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.**